6 (155)
чэрвень

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

Заснавальнікі:

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

Рэдакцыйная калегія:
Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

Рэдакцыйная рада:
Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

Рэдакцыя:
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактары аддзелаў — **Надзея Кушнер, Вітаўт Чаропка**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ

ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Сяргей Сіняк — **Беларуская вобласць: нерэалізаваны праект Белнацкама (жнівень—верасень 1918 г.)** — **3**

САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аляксандр Рытаў — **Вобраз ворага ў сацыяльнай камунікацыі ўлады БССР у 1920-я гады** — **17**

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Настасся Скеп'ян — **Касцюміраваныя забавы ў ВКЛ у XVI—XVII стагоддзях** — **25**

Максім Сохар — **Станаўленне тэатральнай адукацыі Беларусі: акцёрская Студыя ў Ленінградзе ў 1933—1937 гг.** — **33**

Аляксандр КОРЗЮК

"Рабочая папка" настаўніка гісторыі: неабходныя дакументы і матэрыялы

У матэрыяле звяртаецца ўвага на тыя нарматыўныя дакументы, якімі неабходна кіравацца настаўніку гісторыі пры выкладанні прадмета. Прыводзяцца асноўныя элементы вучэбна-метадычнага комплексу, неабходныя для дзейснага педагагічнага працэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыступаючы да работы ў школе, малады настаўнік, як правіла, сутыкаецца ў першую чаргу з шэрагам праблем арганізацыйнага і метадычнага кшталту. Гэта і неабходнасць штодзённай якаснай падрыхтоўкі да ўрокаў, і само іх правядзенне, планаванне і рэфлексія ўласнай педагагічнай дзейнасці, устанаўленне прадуктыўных адносін з вучнямі, іх бацькамі і калегамі, вядзенне значнай колькасці дакументацыі, выкананне абавязкаў класнага кіраўніка і многае іншае. Невыпадкова, што сутыкненне з вялікім аб'ёмам новых абавязкаў часта прыводзіць да пэўнай разгубленасці маладога спецыяліста — ён не ведае, за што і калі яму хапацца. Акрамя таго, перад пачаткам навучальнага года настаўнік, як правіла, знаёміцца з шэрагам нарматыўных дакументаў, у якіх вызначаюцца асаблівасці выкладання гісторыі ў пэўных класах у бягучым годзе. У дадзеным артыкуле мы ахарактарызуем змест і прызначэнне нарматыўных дакументаў, якія рэгламентуюць выкладанне прадмета, і складанне каляндарна-тэматычнага планавання.

Разгледзім нарматыўныя дакументы, якімі ў першую чаргу павінен кіравацца настаўнік гісторыі пры планаванні і ажыццяўленні адукацыйнага працэсу і якія вызначаюць мэту, структуру і змест дадзенага вучэбнага прадмета. Да іх ліку адносяцца Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі", Адукацыйны стандарт і вучэбныя праграмы па прадмеце, нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў агульнаадукацыйных устаноў па вучэбных прадметах, а таксама інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі.

Асноватворным дакументам у выкладанні вучэбнага прадмета з'яўляецца яго Канцэпцыя. **Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя.**



КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.
Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка, у 2003 г. — аспірантуру пры ім. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар больш за 60 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку метадычнага дапаможніка "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.): метад. дапам." (Мн., 2005), вучэбна-метадычнага дапаможніка "Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе" (Мн., 2010, 2011), вучэбна-метадычнага комплексу факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Расійскай Імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (у сааўт. Мн., 2010).

Гісторыя Беларусі" была зацверджана загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 29 мая 2009 г. Дакумент складаецца з уводзін, у якіх абгрунтоўваецца неабходнасць вывучэння гісторыі ў агульнаадукацыйнай школе, вызначаецца яе месца сярод іншых вучэбных прадметаў. Далей у змесце Канцэпцыі прапісаны мэты і задачы гістарычнай адукацыі ў школе, асноўныя функцыі і зыходныя прынцыпы абнаўлення зместу гістарычнай адукацыі, характарызуюцца структура і змест школьнай гістарычнай адукацыі, склад вучэбна-метадычнага комплексу па прадмеце[1].

Наступным дакументам, які рэгламентуе выкладанне прадмета, з'яўляецца **Адукацыйны стандарт.** Гэтым дакументам вызначаюцца асноўныя параметры, якія прымаюцца ў якасці дзяржаўнай нормы адукаванасці чалавека, адлюстроўваюць грамадскі ідэал і ўлічваюць магчымасці канкрэтнага чалавека і сістэмы адукацыі па дасягненню гэтага ідэалу. Распрацоўка стандартаў адукацыі па гісторыі накіравана на ўстанаўленне адзіных дзяржаўных нормаў і патрабаванняў да адукацыі чалавека на розных ступенях сістэмы адукацыі. Дзякуючы гэтаму забяспечваецца адзіны ўзровень адукацыі, які атрымліваецца людзьмі ў розных тыпах адукацыйных устаноў, а таксама ўваходжанне краіны ў сусветную адукацыйную прастору. Стандарт фіксуе мінімальны аб'ём зместу адукацыі, вызначае абавязковы змест прадмета, патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў і іх атэстацыі.

Адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі" быў зацверджаны загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 29 мая 2009 г. У яго змесце адлюстравана мэта і задачы вывучэння прадмета, змест адукацыі і патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў на ўзроўні агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі[2].

Выкладанне школьнага прадмета ажыццяўляецца ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай. Гэтым нарматыўным дакументам вызначаюцца:

— пералік ведаў, уменняў і навыкаў па вучэбным прадмеце, якія неабходна засвоіць вучню ў адпаведнасці з Адукацыйным стандартам;

— логіка і паслядоўнасць вывучэння асобных раздзелаў і тэм; сістэма вядучых ідэй, якія раскрываюць змест раздзелаў, асобных тэм;

— аб'ём вучэбных гадзін на вывучэнне кожнага раздзела, тэмы вучэбнага прадмета.

Выкладанне гісторыі ажыццяўляецца на аснове вучэбных праграм, зацверджаных у 2009 г.[3]. Вылучаюцца наступныя асноўныя *структурныя элементы* вучэбных праграм па прадмеце:

а) тлумачальная запіска, якая ўключае ў сябе мэту, задачы, прынцыпы адбору і пабудовы зместу вучэбнага матэрыялу; кароткую характарыстыку зместу і методыкі выкладання;

б) змест, структураваны па класах, раздзелах і тэмах;

в) пералік асноўных паняццяў, якія прыводзяцца ў канцы кожнай тэмы;

г) пералік спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, якімі вучні павінны авалодаць у працэсе вучэбнай дзейнасці;

д) структураваны спіс літаратуры.

Змест вучэбных прадметаў у праграмах будуецца лінейна або канцэнтрычна. Сутнасць *лінейнага падыходу* заключаецца ў тым, што ў адпаведнасці з дыдактычнымі прынцыпамі сістэматычнасці і паслядоўнасці, шляху ад простага да складанага вучэбны матэрыял размяшчаецца як бы па адной лініі, пры гэтым новая інфармацыя прапануецца на аснове ўжо вядомай і ў цеснай сувязі з ёй. Пры лінейнай пабудове зместу адсутнічаюць дубліраванне і паўторы вучэбнага матэрыялу. Пры *канцэнтрычным падыходзе* дапускаецца паўторнае вывучэнне асобных раздзелаў і тэм на некалькіх узроўнях навучання, прычым прадугледжваецца не простае паўтарэнне, а вывучэнне праблемы на больш высокім тэарэтычным узроўні, з больш глыбокім спасціжэннем сутнасці вывучаемай з'явы ці працэсу (як правіла, на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі). З 2008/2009 навучальнага года вучэбныя праграмы па гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь пабудаваны ў адпаведнасці з лінейным прынцыпам.

Інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі — нарматыўныя дакументы, якія канкрэтызуюць змест адукацыі па вучэбным прадмеце, колькасць гадзін на вывучэнне прадмета ў кожным класе і пералік вучэбных дапаможнікаў, змяшчаюць прыкладнае тэматычнае планаванне па прадмеце, метадычныя рэкамендацыі па вывучэнню тых ці іншых тэм, інструкцыі па правядзенню кантролю ведаў і ўменняў вучняў, фарміраванню ў іх культуры вуснай і пісьмовай мовы. Інструктыўна-метадычныя пісьмы па кожным прадмеце публікуюцца да пачатку новага навучальнага года ў "Настаўніцкай газеце", прадметных навукова-метадычных часопісах, а таксама размяшчаюцца на сайце Нацыянальнага інстытута адукацыі (www.adu.by).

У сваёй прафесійнай дзейнасці настаўнік гісторыі кіруецца **Нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў** агульнаадукацыйных устаноў па вучэбных прадметах і, у прыватнасці, па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі[4]. У гэтым дакуменце пералічваюцца функцыі дзесяцібальнай сістэмы вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, вылучаюцца пяць узроўняў засваення вучэбнага матэрыялу, характарызуюцца віды і формы кантролю. Настаўнік павінен памятаць, што *паўрочны кантроль* праводзіцца з мэтай праверкі і ацэнкі засваення вучнямі вучэбнага матэрыялу ў працэсе вывучэння тэмы і носіць стымулюючы, карэкціруючы і выхаваўчы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

характар. Пры яго ажыццяўленні ацэньваецца працэс вучэбнай дзейнасці школьнікаў, пазнавальныя і агульнавучэбныя ўменні, выкарыстанне рацыянальных спосабаў выканання заданняў з улікам цікавасці да вучэння, імкнення да дасягнення пастаўленай мэты і іншых індывідуальных і асобасных якасцей. Што датычыцца *тэматычнага кантролю*, то ён праводзіцца з мэтай праверкі і ацэнкі засваення вучэбнага матэрыялу пэўнай тэмы. Пры яго ажыццяўленні ацэньваюцца дасягненні вучняў не па асобных элементах (як пры паўрочным кантролі), а ў лагічнай сістэме, якая адпавядае структуры вучэбнай тэмы. Пры правядзенні тэматычнага кантролю на ўроку гісторыі настаўніку неабходна памятаць, што працягласць кантролю не павінна перавышаць 25 хвілін.

Асноўныя віды кантролю ажыццяўляюцца ў вуснай, пісьмовай, практычнай формах або ў іх спалучэнні. Выбар метадаў і сродкаў для кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў ажыццяўляецца педагогам. У дачыненні да ўрока гісторыі гэта азначае, што паўрочны кантроль вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, напрыклад, можа праводзіцца ў вуснай і пісьмовай формах ці ў іх спалучэнні шляхам правядзення індывідуальнага, групавога і франтальнага апытання з выкарыстаннем пытанняў і заданняў, якія змяшчаюцца ў падручніках, вучэбных, вучэбна-метадычных дапаможніках, дыдактычных матэрыялах. Тэматычны кантроль вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў можа ажыццяўляцца ў вуснай і пісьмовай формах ці ў іх спалучэнні з выкарыстаннем розных метадаў: апытання, самастойнай работы па вырашэнню праблемных заданняў і пазнавальных задач, тэсціраванні, эсэ, рэферата, заліку і інш.

У нормах ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці змяшчаюцца ўказанні па выстаўленні адзнак за чвэрць і за год, паказчыкі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў пры ажыццяўленні кантролю па гісторыі, характарыстыка істотных і неістотных памылак.

Эфектыўнае засваенне вучнямі зместу гістарычнай адукацыі пад кіраўніцтвам настаўніка магчыма толькі пры наяўнасці разнастайных друкаваных, выяўленчых і электронных сродкаў навучання. У сукупнасці яны складаюць **вучэбна-метадычны комплекс** па прадмеце. Адукацыйны стандарт і вучэбная праграма па гісторыі з'яўляюцца двума яго першымі абавязковымі элементамі. Акрамя гэтага, вучэбна-метадычны комплекс звычайна ўключае наступныя кампаненты: падручнікі або вучэбныя дапаможнікі, зборнікі пазнавальных задач і праблемных заданняў (практыкумы), хрэстаматыі, кнігі для чытання, рабочыя сшыткі, слоўнікі, даведнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, дыдактычныя матэрыялы, табліцы, схемы, дыягнастычныя і картаграфічныя сродкі, аўдыёвізуальныя і электронныя сродкі навучання і інш.[5].

Вучэбна-метадычныя комплексы закліканы:

— забяспечыць паспяховае засваенне вучнямі зместу адукацыі па вучэбным прадмеце;

— актывізаваць пазнавальную і творчую дзейнасць вучняў па авалоданні зместам вучэбнага прадмета;

— садзейнічаць прымяненню ў навучальным працэсе сучасных педагагічных тэхналогій;

— садзейнічаць сістэматызацыі і інтэграцыі ведаў вучняў.

Падручнік ці вучэбны дапаможнік змяшчае сістэматызаваную і адаптаваную да узроставых асаблівасцей школьнікаў вучэбную інфармацыю. Падручнікі (вучэбныя дапаможнікі) па гісторыі ствараюцца ў адпаведнасці са структурай і зместам вучэбнай праграмы. Усе кампаненты падручніка (вучэбнага дапаможніка) — асноўны, дадатковы, тлумачальны тэксты, метадычны апарат і ілюстрацыйны матэрыял — павінны быць узаемазвязанымі і арыентаванымі на эфектыўнае засваенне вучнямі зместу гістарычнага матэрыялу.

Хрэстаматыя па гісторыі прызначана для фарміравання ў вучняў спецыяльных уменняў у працэсе работы з гістарычнымі дакументамі і пашырэння іх ведаў па вучэбным прадмеце. Яна змяшчае фрагменты работ айчынных і замежных даследчыкаў, дакументаў дзяржаўнага (законы, указы і інш.) і міжнароднага (дагаворы, пагадненні) характару, праграм палітычных партый, выступленняў палітычных дзеячаў і г.д., а таксама неабходныя каментарыі, пытанні і заданні.

Кніга для чытання прызначана для фарміравання ў вучняў вобразна-эмацыянальнага ўяўлення аб асноўных аб'ектах вывучэння і можа змяшчаць фрагменты твораў мастацкай, навукова-папулярнай, публіцыстычнай літаратуры.

Дапаможнікі для арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў прадстаўлены рабочымі сшыткамі, практыкумамі, зборнікамі пазнавальных задач і праблемных заданняў, прызначанымі для фарміравання агульнавучэбных і спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Іх выкарыстанне дапамагае забяспечыць эфектыўнае засваенне вучнямі дзейнаснага кампанента зместу гістарычнай адукацыі.

Вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўніка змяшчае матэрыялы, накіраваныя на інфармацыйнае і метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу. Матэрыялы па методыцы выкладання гісторыі такія: тэматычнае і паўрочнае планаванне, распрацоўкі пазакласных вучэбных заняткаў, а таксама інфармацыя, прызначаная для павышэння кваліфікацыі настаўнікаў (спісы асноўнай і дадатковай літаратуры па тэмах; інфармацыйныя матэрыялы па актуальных праблемах развіцця гістарычнай навукі; рэкамендацыі па арганізацыі, ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ардынацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў, кантролю іх вучэбных дасягненняў і г.д.).

Дыягнастычныя матэрыялы (тэставыя, а таксама рознаўзроўневыя заданні для правядзення паўрочнага і тэматычнага кантролю) прызначаны для самакантролю, арганізацыі трэнінгавай работы, а таксама для вызначэння ўзроўню навучання вучняў у адпаведнасці з патрабаваннямі 10-бальнай сістэмы ацэнкі.

Картаграфічныя матэрыялы (гістарычныя насценныя карты, атласы, контурныя карты) прызначаны для засваення навучэнцамі адпаведнага гістарычнага матэрыялу, фарміравання картаграфічных ведаў і ўменняў.

Выкладанне вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі" прадугледжвае шырокае выкарыстанне *аўдыёвізуальных і электронных сродкаў навучання* на ўсіх этапах арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў у якасці падтрымкі традыцыйных сродкаў навучання.

Пасля ўважлівага вывучэння нарматыўных дакументаў, вучэбных дапаможнікаў і іншых наяўных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу падрыхтоўка настаўніка да выкладання гісторыі заключаецца ў складанні **каляндарна-тэматычнага планавання**. Каляндарна-тэматычнае планаванне рыхтуецца, як правіла, на кожную асобную чвэрць ці на паўгоддзе, і таму работа над ім пачынаецца перад пачаткам навучальнага года. Каляндарна-тэматычны план у пэўнай ступені ўяўляе сабою мадэль працэсу выкладання прадмета, распрацаваную настаўнікам, якая адлюстроўвае стратэгію яго выкладання ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай. Каляндарна-тэматычны план — гэта метадычны дакумент, які вызначае тэматыку вучэбных заняткаў у пэўным класе і каляндарныя тэрміны іх правядзення. Пры яго складанні настаўніку неабходна кіравацца[6]:

— вучэбным планам школы, які вызначае колькасць гадзін у тыдзень на прадмет у кожным класе;

— вучэбнай праграмай, якая вызначае паслядоўнасць вывучэння і змест вучэбнага матэрыялу;

— вучэбнымі дапаможнікамі для школьнікаў;

— патрабаваннямі санітарных норм, правіл і гігіенічных нарматываў "Гігіенічныя патрабаванні да ўладкавання, зместу і арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі", зацверджанымі Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Пры складанні каляндарна-тэматычнага плана і планаванні аб'ёму дамашняга задання настаўнік павінен улічваць, што згодна з нормамі гэтага дакумента дамашнія заданні павінны задавацца вучням з улікам магчымасці іх выканання ў V—VI класах за 2 гадзіны, VII—VIII класах — 2,5 гадзіны, IX—XI класах — 3 гадзіны (часавыя нормы ўказаны з улікам падрыхтоўкі дамашніх заданняў па ўсіх вучэбных прадметах аднаго навучальнага дня).

На практыцы настаўнікі пераважна карыстаюцца гатовым прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем, распрацаваным супрацоўнікамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага інстытута адукацыі[7]. Такі план выконвае функцыю арыенціра для ажыццяўлення далейшага паўрочнага планавання. Такім чынам, у выніку каляндарна-тэматычнага планавання настаўнік атрымлівае ў сваё распараджэнне перспектыўную мадэль вывучэння кожнай тэмы канкрэтнага раздзела па гісторыі, якая істотна палегчыць яго падрыхтоўку да ўрока.

Такім чынам, мэта, задачы, структура і змест гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе вызначаюцца Канцэпцыяй вучэбнага прадмета, Адукацыйным стандартам і вучэбнымі праграмамі. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў дазваляюць вызначыць і ацаніць ступень валодання вучэбным матэрыялам па гісторыі. Аператыўная інфармацыя, якую неабходна ўлічыць пры выкладанні гісторыі ў наступным навучальным годзе, змяшчаецца ў інструктыўна-метадычным пісьме Міністэрства адукацыі. Гэтыя дакументы павінны заўсёды быць у настаўніка ў своеасаблівай *"рабочай папцы"*, каб у выпадку неабходнасці ён мог звярнуцца да іх зместу.

Наступным этапам падрыхтоўкі настаўніка да выкладання прадмета з'яўляецца складанне ўласнага каляндарна-тэматычнага плана або азнаямленне з яго гатовым друкаваным варыянтам для далейшай падрыхтоўкі паўрочнага планавання. Якасць выканання гэтай падрыхтоўчай работы ў многім вызначае эфектыўнасць педагагічнай дзейнасці настаўніка, а значыць, і навучання прадмету.

[1] Концепция учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" // Беларускі гістарычны часопіс. 2009, № 6. С. 14—17.

[2] Образовательный стандарт учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" // Беларускі гістарычны часопіс. 2009, № 7. С. 18—21.

[3] Учебные программы для общеобразовательных школ с русским языком обучения. Всемирная история. История Беларуси. V—XI классы / Нац. институт образования. Мн., 2009.

[4] Нормы оценки результатов учебной деятельности учащихся общеобразовательных учреждений по учебным предметам. Оценка результатов учебной деятельности учащихся по учебному предмету "Всемирная история. История Беларуси" // Беларускі гістарычны часопіс. 2009, № 6. С. 17—19.

[5] Ганущенко Н., Краснова М. Учебно-методический комплекс как фактор повышения качества исторического образования // Гісторыя і праблемы выкладання. 2010, № 2. С. 8—12.

[6] Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии-2. Мн., 2010. С. 87.

[7] Всемирная история. История Беларуси: 2011/2012 учебный год: 5—11-е классы: примерное календарно-тематическое планирование: пособие для учителей учреждений общего среднего образования // М.А.Краснова, Н.Н.Ганущенко, С.А.Кудрявцева. Мн., 2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ